Дзяржаўная ўстанова адукацыі
”Яслі-сад-базавая школа № 15 г.Полацка“

# АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ”ВЫКАРЫСТАННЕ СРОДКАЎ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ ЛІНГВІСТЫЧНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў V-VII КЛАСАХ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ПАЗНАВАЛЬНАЙ АКТЫЎНАСЦІ ВУЧНЯЎ“

Осіпава Наталля Вітальеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
8 (029) 599-25-26;
e-mail: odarevskaya78@mail.ru

## Актуальнасць вопыту

Адметнасцю зместу і будовы вучэбнай праграмы па беларускай мове з’яўляецца тое, што ў цэнтры ўвагі – вучань як суб’ект, зацікаўлены ў пазнанні, вывучэнні разнастайных законаў беларускай мовы і правіл карыстання ёй; яго запатрабаванні ў сферы маўлення як форме грамадскай дзейнасці і спосабе праяўлення ўласнай жыццёвай актыўнасці [1, с. 4]. Такім чынам падкрэсліваецца арыентацыя адукацыі на сучасным этапе не столькі на засваенне вучнямі вызначанай сумы ведаў, колькі на развіццё асобы школьніка і яго пазнавальных здольнасцей. Таму лічу важным пры вывучэнні беларускай мовы акцэнт перанесці на сам працэс пазнання, яго арганізацыю і кіраванне, працэс, які будзе характарызавацца цікавасцю і імкненнем школьніка да пазнання, да эфектыўнага авалодання ведамі і спосабамі дзеяння, накіраванасцю на развіццё самастойнасці, пошукава-творчым падыходам да засваення зместу адукацыі, што магчыма толькі пры ўмове высокай пазнавальнай актыўнасці вучняў.

Аднак мова – гэта складаная знакавая сістэма, авалоданне якой патрабуе ад вучняў неверагодных намаганняў, складаных мысліцельных аперацый. Таму цікавасць і матывацыя школьнікаў да вывучэння беларускай мовы часта зніжаецца. Пра гэта сведчаць і рэкамендацыі па выніках рэспубліканскай кантрольнай работы па вучэбным прадмеце ”Беларуская мова“ ў 2018/2019 навучальным годзе, у якіх адзначана, што 51,8% рэспандэнтаў сярод асноўных прычын цяжкасцей у вывучэнні прадмета ўказалі нізкую матывацыю, 54,4% недастаткова сфарміраванае ўменне аналізаваць, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, рабіць вывады, а 55,9% няўменне лагічна выкладаць свае думкі з выкарыстаннем прадметнай тэрміналогіі [2]. Сапраўды, моўныя (лінгвістычныя) паняцці характарызуюцца больш высокай ступенню абстрактнасці ў параўнанні з іншымі з’явамі, за якімі назірае школьнік, бо гэта вынік абстрагавання і абагульнення істотных прымет, уласцівых фанемам, марфемам, словам, словазлучэнням, сказам і г.д. Інакш кажучы, моўнае паняцце

– гэта абагульненне абагуленага. Я пераканалася, што вучні, якія не могуць абстрагаваць граматычнае значэнне слова ад яго лексічнага значэння, маюць значныя цяжкасці пры засваенні лінгвістычных паняццяў. І тады вучань становіцца не актыўным удзельнікам працэсу пазнання, а пасіўным назіральнікам, не зацікаўленым у набыцці новых ведаў, не здольным усвядоміць істотныя і неістотныя прыметы паняццяў, устанавіць узаемасувязі паміж імі. Якасць засвоеных ведаў зніжаецца, працэс навучання становіцца малавыніковым.

Лічу, што эфектыўным сродкам для развіцця пазнавальнай актыўнасці школьнікаў, а таксама для паспяховага засваення лінгвістычных паняццяў, з’яўляецца візуалізацыя (візуальны – ад лац. ”зрокавы“). Яна дазваляе пры арганізацыі працэсу пазнання  прадставіць інфармацыю ў наглядным вобразе, які можа быць раскрыты на аснове разумовых аперацый. Аднак праблеме навучання і развіцця вучняў сродкамі візуалізацыі ў псіхолага-педагагічнай літаратуры надаецца недастаткова ўвагі, бо іх выкарыстанне абапіраецца на тыя функцыі і працэсы мыслення, якія слаба сфарміраваны ў малодшым і сярэднім школьным узросце. Школьнік амаль не здольны да абстрагавання, абагульнення, аналізу і сінтэзу, яго ўяўленне не дысцыплінавана і падпарадкоўваецца выключна эмоцыям, а не зададзенаму настаўнікам накірунку. Таму часцей нагляднасць мае выключна ілюстрацыйны характар і не стварае ўмовы для развіцця мыслення школьнікаў, арганізацыі іх прадметна-практычнай дзейнасці і зносін. Візуалізацыя ж матэрыялу ў  працэсе навучання разглядае наглядныя вобразы не як дапаможны, а як вядучы сродак, здольны арганізаваць працэс пазнання, фарміраваць цікавасць да навучання, развіваць пазнавальную актыўнасць, а значыць, забяспечыць эфектыўнае засваенне ведаў і асобаснае развіццё вучняў.

**Мэта вопыту:** павышэнне ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў пры засваенні беларускай мовы сродкамі візуалізацыі лінгвістычных паняццяў.

Для дасягнення пастаўленай мэты рашаліся наступныя задачы:

1. Вызначыць спецыфіку і сучасныя падыходы да выкарыстання сродкаў візуалізацыі для развіцця пазнавальнай актыўнасці на ўроках беларускай мовы.

2. Вызначыць арганізацыйна-педагагічныя ўмовы эфектыўнага выкарыстання сродкаў візуалізацыі для развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў V-VII класаў.

3. Распрацаваць і апрабіраваць сродкі візуалізацыі лінгвістычных паняццяў пры вывучэнні асноўных тэм граматыкі беларускай мовы.

4. Ацаніць эфектыўнасць прымянення сродкаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы.

## Апісанне тэхналогіі вопыту

**Вядучая ідэя** майго вопыту: выкарыстанне распрацаваных і адаптаваных сродкаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы будзе садзейнічаць развіццю пазнавальнай актыўнасці вучняў і эфектыўнаму засваенню вучэбнага матэрыялу.

Мой вопыт грунтуецца на асноўных ідэях развіцця пазнавальнай актыўнасці, акрэсленых Т.І. Шамавай, якая адзначае, што пазнавальная актыўнасць як уласцівасць асобы праяўляецца і фарміруецца ў дзейнасці [3].

Пазнавальная актыўнасць з аднаго боку з’яўляецца формай самаарганізацыі і самарэалізацыі вучняў, а з другога – вынікам намаганняў педагога ў арганізацыі вучэбнай дзейнасці і станаўлення іх у якасці суб’ектаў гэтай дзейнасці. Арганізаваць такую дзейнасць на ўроках беларускай мовы падчас вывучэння граматыкі мне дапамагаюць сродкі візуалізацыі. Вялікі ўплыў на станаўленне майго педагагічнага вопыту па іх выкарыстанні зрабілі працы А.А. Вярбіцкага і А.Б. Ярмілавай. А.А. Вярбіцкі размяжоўвае паняцці ”візуальны“, ”візуальныя сродкі“ і ”наглядны“, ”наглядныя сродкі“. Візуалізацыя – гэта не проста ілюстрацыя ці дэманстрацыя вобраза, што патрабуе мінімальную пазнавальную актыўнасць вучняў, гэта вобраз, які служыць апорай для развіцця разумовых і практычных дзеянняў [4, с.115]. А.Б.

Ярмілава разглядае візуалізацыю як вядучы прадуктыўны сродак, здольны павысіць пазнавальную актыўнасць, замацаваць устойлівую цікавасць да навучання, а значыць, забяспечыць развіццё навучэнцаў (паскарае ўспрыманне, развівае аналітычную памяць, увасабленне, абстрактнае мысленне) [5].

Пры выкарыстанні сродкаў візуалізацыі ствараецца *зрокавы вобраз*, які заўсёды канкрэтны, знаёмы і зразумелы вучням, звязаны з навакольным светам, што выклікае цікавасць у вучняў, дазваляе ім дакладна перадаваць думкі, а таксама сэнс абстрактнага паняцця, у тым ліку лінгвістычнага, садзейнічае яго хуткаму і свядомаму запамінанню. Акрамя гэтага, візуалізацыя дапамагае ўявіць і структурыраваць асноўны вучэбны матэрыял, дапоўніць яго, забяспечыць даступнасць і лагічнасць у падачы інфармацыі, прадэманстраваць узаемасувязь паміж тэкстам і графічным адлюстраваннем. Я пераканалася, што сродкі візуалізацыі забяспечваюць пазнавальную актыўнасць вучняў, бо задавальняюць і замацоўваюць такія значныя для іх запыты, як запыты ў новых ведах, у творчасці, у самасцвярджэнні, у перажыванні пачуцця поспеху, у зносінах.

Для выкарыстання сродкаў візуалізацыі з мэтай развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў мною распрацавана *сістэма патрабаванняў*, якая грунтуецца на асноўных прынцыпах дыдактыкі: навуковасці, нагляднасці, свядомасці і актыўнасці, сістэматычнасці, паслядоўнасці і пераемнасці, трываласці, сувязі тэорыі з практыкай:

прастата адлюстравання;

апора на жыццёвы вопыт вучняў;

арганізацыя гульнявой дзейнасці;

рашэнне праблемы;

самастойны ўдзел вучняў;

стварэнне сітуацыі поспеху;

дыялог (дыялагічныя зносіны).

Дадзеныя складнікі вызначаюць арганізацыйна-педагагічныя ўмовы эфектыўнага выкарыстання сродкаў візуалізацыі для развіцця пазнавальнай актыўнасці вучняў V-VII класаў.

Акрэсліўшы дыдактычныя магчымасці сродкаў візуалізацыі і арганізацыйна-педагагічныя ўмовы іх выкарыстання, я суаднесла іх з узроўнямі развіцця пазнавальнай актыўнасці (па Т.І.Шамавай) [3] і прадставіла ў выглядзе схемы.




Раскрыю сутнасць кампанентаў прапанаванай схемы на прыкладзе іх выкарыстання падчас засваення вучнямі V-VII класаў асноўных правілаў граматыкі.

У V класе пры паўтарэнні вывучанага ў пачатковай школе выкарыстоўваю прапанаваныя Ю.Дземідам [6] *карты падарожжаў* па краінах, дзе пражываюць Назоўнікі, Прыметнікі, Дзеясловы. Маршрут падарожжаў адзначаны на контурных картах, якія раздаюцца вучням да пачатку ўрока. Карты дазваляюць арганізаваць урок у форме гульні-падарожжа, займальна і творча паўтарыць граматычныя прыметы назоўніка, прыметніка, дзеяслова. У працэсе падарожжа вучні зафарбоўваюць на карце тыя мясціны, якія наведалі, напрыклад, горад Склонавічы (краіна Назовія), лугавінку Дажджынкаў-зарадзінкаў (”У пошуках Прыметніка“), горад Множны (краіна Дзеясловія). У выніку працы на ўроку ў дзяцей застаюцца маляўнічыя карты – своеасаблівыя апорныя схемы па тэмах (дадатак 1).

Такія схемы-апоры дапамагаюць вучню разумець і распазнаваць паняцці, іх істотныя прыметы, абапіраючыся на падказку, засвоіць алгарытм выкарыстання правіла, а настаўніку – мадэляваць працэс навучання, дакладна планаваць, актыўна кіраваць ім. Карты падарожжаў з'яўляюцца першай прыступкай паспяховага складання *кластараў*, якія ўтрымліваюць ужо больш абагуленую і сістэматызаваную інфармацыю. Трэба адзначыць, што мае пяцікласнікі могуць паспяхова складаць, а потым і агучваць простыя кластары, сярод якіх ”Займеннік як часціна мовы“, ”Змяненне дзеясловаў па часах і ліках“, ”Правапіс канчаткаў дзеясловаў“, гэта значыць у вучняў пастулова фарміруецца здольнасць выкарыстоўваць веды ў нетыповых сітуацыях.

Заўважыўшы эфектыўнасць выкарыстання карт падарожжаў, прапанаваных Ю. Дземідам, я распрацавала свае карты па тэмах ”Сказ як сінтаксічная адзінка“ і ”Марфемная будова слова“ (дадатак 1). Карта ”Сказ“ дапамагае ў V класе не толькі эфектыўна паўтарыць вывучанае ў ІІІ-ІV класах, але і стымулюе пазнавальную актыўнасць вучняў, матывуе іх да самастойнай дзейнасці. Гэтая ж карта служыць апорай пры засваенні паняццяў ”даданыя члены сказа“, ”аднародныя члены сказа“ (гэтым паняццям трэба было знайсці ”месца жыхарства“ на карце, дамаляваўшы іх самастойна). Карта ”Будуем горад“ дапамагае наладзіць вучэбны занятак прафарыентацыйнай накіраванасці, на якім вучні не толькі паглыбляюць веды, але і выпрацоўваюць эмацыянальна-ацэначныя адносіны да працэсу і вынікаў пазнання. Карты падарожжаў дазваляюць вучню прайсці шлях ад першаснага асэнсавання і ўзнаўлення ведаў да пошуку нестандартных спосабаў дзеяння і іх ацэньвання.

Пасля вывучэння часціны мовы прапаную вучням намаляваць яе ў выглядзе якой-небудзь асобы ці прадмета, указаўшы асноўныя граматычныя прыметы. *”Свая апора“* як сродак візуалізацыі не толькі дазваляе зацікавіць вучняў, а і развівае ўменне прагназаваць, аналізаваць, сістэматызаваць і абагульняць інфармацыю (дадатак 2). Школьнікі дзейнічаюць у знаёмай ім сферы, але ствараюць свой інфармацыйны прадукт, які трэба прадставіць

аднакласнікам, агучыўшы яго. Такія прадуктыўныя дзеянні лічу сапраўднай творчасцю.

У VI класе пры вывучэнні адной з самых складаных тэм граматыкі “Правапіс канчаткаў назоўнікаў” выкарыстоўваю ўжо больш абагульненыя схемы, так званыя *”шпаргалкі“* (індывідуальныя і дэманстрацыйныя) (дадатак 3). Калі ўводжу схемы, прапускаю некаторыя дадзеныя, што дазваляе вучням быць не проста слухачамі, а актыўнымі ўдзельнікамі працэсу навучання. Дадзеныя схемы з’яўляюцца своеасаблівымі алгарытмамі для правільнага напісання канчатка назоўніка, яны вымушаюць вучняў думаць, а не атрымліваць гатовы вынік.

Пры арганізацыі ўрокаў абагульнення выкарыстоўваю ў якасці сродку візуалізацыі *”Ажыўленне“*: кожны вучань выбірае картку, на якой адлюстравана адно з вывучаных граматычных паняццяў, напрыклад, ”род“, ”лік“, ”адзіночны“, ”множны“, ”скланенне“, ”склон“, ”час“ і інш. Вядучым з карткамі ”Назоўнік“, ”Прыметнік“, ”Дзеяслоў“, ”Займеннік“ трэба знайсці сабе сяброў. Дадзены прыём дазваляе арганізаваць зносіны на ўроку, садзейнічае развіццю мыслення, бо вучням трэба аргументаваць выбар, выкарыстаць веды ў нетыповай сітуацыі.

У V класе дынамічным сродкам візуалізацыі з’яўляецца *казка-прэзентацыя ”Галоўныя члены сказа“.* Створаная мною прэзентацыя нагадвае мультфільм пра вялікую і дружную сям’ю Сказ (дадатак 4), дапамагае не толькі прыцягнуць увагу вучняў, павысіць іх матывацыю да вывучэння лінгвістычных паняццяў, але і растлумачыць новую тэму, узбагаціць слоўнікавы запас, стварыць праблемную сітуацыю. Граматна распрацаваны дыдактычны прадукт спрыяе правядзенню даследавання ў межах урока, робіць занятак у пэўнай ступені інтэрактыўным.

Падчас вывучэння тэмы ”Аднародныя члены сказа“ ў V класе зразумець і засвоіць сродкі сувязі, парадак размяшчэння і месца аднародных членаў у сказе, а таксама пастаноўку знакаў прыпынку вучням дапамагаюць *смайлікі* (дадатак 5). Школьнікам прапаноўваецца моўны матэрыял для назірання,

аналізу і наступнага мадэлявання спачатку пад кіраўніцтвам настаўніка, а потым і для самастойнай дзейнасці. Часткова-пошукавы метад, які выкарыстоўваецца мною пры рабоце са смайлікамі, садзейнічае ўключэнню вучняў у працэс здабычы ведаў, актывізацыі іх разумовай дзейнасці.

Праілюстраваць ключавыя моманты аповеду падчас знаёмства з новым лінгвістычным паняццем, напрыклад, са структурай такой адзінкі сінтаксісу, як тэкст, і паказаць узаемасувязі паміж часткамі тэксту дапамагае *скрайбінг* – спосаб візуалізацыі інфармацыі пры дапамозе графічных сімвалаў, якія адлюстроўваюць змест і ўнутраныя сувязі. Падчас эўрыстычнай гутаркі на ўроку я адразу ілюструю вучэбны матэрыял маркерам на белай дошцы ці ватмане. Стварэнне вобразаў выклікае ў вучняў візуальныя асацыяцыі з пачутым, павышае пазнавальную актыўнасць, пабуджае да творчай дзейнасці, што забяспечвае паспяховае засваенне інфармацыі (дадатак 6).

Заўважыла: многія вучні малююць разам са мной, а потым беражліва захоўваюць малюнкі, схемы, табліцы як уласна створаныя, так і тыя, што я распрацоўвала да ўрокаў. Самае галоўнае пры гэтым тое, што дзеці пры неабходнасці выкарыстоўваюць дадзеныя падказкі, а гэта значыць, што яны ведаюць, якая ім інфармацыя патрэбна і як яе выкарыстаць. Так, у вучняў з’яўляюцца індывідуальныя *папкі з падказкамі*. Змешчаныя ў іх апоры кампактна ілюструюць змест, садзейнічаюць сістэмнасці ведаў. Актыўнасць і самастойнасць дзяцей пры выкарыстанні дадзеных падказак дапамагаюць ажыццявіць паступовы пераход да рэалізацыі такога сродку візуалізацыі, як *скетчноўцінг* – візуальнага сродку фіксавання інфармацыі з мінімальнай колькасцю запісанага тэксту. Гэта своеасаблівая візуальная нататка, элементамі якой з’яўляюцца рукапісны тэкст, малюнкі і схемы з базавых элементаў (круг, квадрат, трохвугольнік, лінія, кропка). Скетч дапамагае структураваць, запамінаць і ўсведамляць інфармацыю, генерыраваць ідэі і думкі, творча асэнсоўваць інфармацыю (дадатак 6).

**Выніковасць і эфектыўнасць вопыту**

Вызначэнне эфектыўнасці вопыту было арганізавана мною на працягу 2017/2018 і 2018/2019 навучальных гадоў і вызначалася па наступных крытэрыях асобаснага і пазнавальнага развіцця вучняў (дадатак 7):

узровень унутранай матывацыі;

узровень пазнавальнай цікавасці;

узровень пазнавальнай актыўнасці;

узровень засваення ведаў па граматыцы беларускай мовы.

У працэсе развіцця пазнавальнай актыўнасці вучань выступае як самадастатковая асоба: ён сам ставіць мэты, шукае шляхі і спосабы іх дасягнення, задавальняючы свае інтарэсы і запыты. Сродкі візуалізацыі дапамагаюць мне фарміраваць у вучняў унутраную матывацыю, пры гэтым 41% шасцікласнікаў дэманструе высокі ўзровень унутранай матывацыі.

Паспяховае засваенне лінгвістычнага паняцця немагчыма без наяўнасці ў вучняў пазнавальнай цікавасці, без высокай пазнавальнай актыўнасці вучняў. Выкарыстанне сродкаў візуалізацыі спрыяла павелічэнню колькасці вучняў, якія маюць высокі ўзровень пазнавальнай актыўнасці (36% сярод вучняў пятага класа і 54% сярод вучняў шостага класа), а гэта значыць, што большасць школьнікаў гатовы да выканання заданняў прадуктыўна-творчага характару. Пра гэта сведчыць і методыка ”Канверты“ (дадатак 7). Канверт з заданнямі па беларускай мове выбралі 50% шасцікласнікаў, а палова з іх аддалі перавагу заданням пошукавага характару. Значыць, цікавасць да беларускай мовы ўзнікае, пазнавальная актыўнасць павышаецца, што з’яўляецца абавязковай умовай для паспяховага засваення ведаў.

Аналізаваліся і вынікі вучэбнай дзейнасці вучняў у адпаведнасці з узроўнем засваення граматыкі беларускай мовы. Вучням прапаноўваліся дыягнастычныя тэсты, якія змяшчалі заданні на адрозненне, узнаўленне, разуменне, прымяненне і канструяванне. Зменшылася колькасць вучняў (да 14%), што выконвалі заданні выключна на адрозненне і ўзнаўленне паняццяў, павялічылася колькасць вучняў (да 18%), якія паспяхова выконвалі заданні

творчага характару, а заданні на прымяненне тэарэтычных ведаў здолелі выканаць 45% вучняў. Вучні прадэманстравалі ўменні адрозніваць паняцці, выдзяляць іх істотныя і неістотныя прыметы, абстрагаваць граматычнае значэнне слова ад лексічнага, выкарыстоўваць веды ў знаёмай сітуацыі па ўзоры і ў сітуацыі нетыповай, якая патрабуе рашэння незнаёмай для вучня задачы.

Акрамя гэтага, павышаецца выніковасць удзелу вучняў у прадметных конкурсах і алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры. Ужо ў пятым класе вучні дэманструюць на раённай алімпіядзе добрыя вынікі (у 2016, 2017, 2018, 2019 годзе мае вучні былі ў ліку прызёраў, з поспехам выканаўшы ад 52% да 76% заданняў), і гэта, безумоўна, дзякуючы ведам, набытым і сфарміраваным падчас эфектыўнай арганізацыі працэсу навучання на вучэбных занятках.

**Заключэнне**

Візуалізацыя лінгвістычных паняццяў садзейнічае інтэнсіфікацыі працэсу навучання, развіццю самастойнасці і пазнавальнай актыўнасці вучняў. Метадычна граматны падыход да выкарыстання сродкаў візуалізацыі забяспечвае дастатковы ўзровень засваення лінгвістычных паняццяў, стымулюе развіццё творчага падыходу, бо візуалізуюцца не толькі вобразы, але і думкі, ідэі, паняцці.

Візуалізацыя з’яўляецца прамежкавым этапам паміж вучэбным матэрыялам і выніковасцю навучання, дазваляе ўявіць вывучаемыя з’явы ў тых абласцях, у якіх непасрэдна нагляднае ўспрыманне немагчыма, напрыклад, пры вывучэнні лінгвістычных паняццяў.

Дадзены вопыт прадстаўлены мною на аўкцыёне педагагічных ідэй ”Ад педагагічнага майстэрства – да якасці адукацыі“, які быў арганізаваны ў рамках штогадовага школьнага метадычнага фестывалю ”Майстэрства. Вопыт. Творчасць“ (дадатак 8, 9).

Зварот да сродкаў візуалізацыі дыктуецца павелічэннем аб’ёму інфармацыі, для пераапрацоўкі і запамінання якой неабходны новыя кампактныя і мабільныя сродкі, таму лічу неабходным і далей працаваць у

дадзеным накірунку, шукаючы новыя спосабы візуалізацыі моўных паняццяў, у тым ліку з выкарыстаннем сучасных электронных сродкаў навучання.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. Беларуская мова. V-IX класы. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2017. – 116 с.

2. Рэкамендацыі па выніках рэспубліканскай кантрольнай работы па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” (X клас) у 2018/2019 вучэбным годзе [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.adu.by/images/2019/07/rek-kachestvo-obr-bel-mova-2018-2019.pdf – Дата доступу: 14.07.2020.

3. Тимиршина, А.В. Понятие познавательной активности в психолого-педагогических исследованиях / А.В. Тимиршина [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://edu-time.ru/pub/101663. – Дата доступа: 13.07.2020.

4. Вербицкий, А.А. Личностный и компетентностный подходы в образовании. Проблемы интеграции / А.А. Вербицкий, О.Г. Ларионова. – М : Логос, 2009. – 336 с.

5. Ермилова, Е.Б. Визуализация обучения как средство развития учебных способностей младшего школьника: дис. канд. пед. наук: 13.00.01 / Е.Б. Ермилова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://childpsy.ru/dissertations/id/18447.php . – Дата доступа: 09.03.2019.

6. Дземід, Ю.Г. Вывучаем часціны мовы / Ю.Г. Дземід // Пачатковая школа. – 2009. – № 1. – С. 57-58.

Дадатак 1

## Карты падарожжаў










СКАЗ
МЭТА ВЫКАЗВАННЯ
ІНТАНАЦЫЯ
ПАВЕДАМЛЕННЕ
ПЫТАННЕ
АПАВЯДАЛЬНЫЯ
ПЫТАЛЬНЫЯ
ПАБУДЖАЛЬНЫЯ
НЯКЛІЧНЫ
КЛІЧНЫ
ГАЛОЎНЫЯ
ЧЛЕНЫ СКАЗА
ДАДАНЫЯ
ХТО? ШТО?
ДЗЕЙНІК
ВЫКАЗНІК


Будуем горад
прыстаўка
суфікс
корань
аднакаранёвыя словы
канчатак
аснова
формы слова

# Свая апора


Н.
П.
СЯБРЫ


хто? што?
Н.
каго? чаго?
Р.
каго? што?
В.
каму? чаму?
Д.
кім? чым?
Т.
М.
н.р.
м.р.
ж.р.
3
1
2


Д
Р
Н
В
Т
М
1
2
3
ГКХ


Н.с.
Р.с.
ж.р.
а, я
м.р.
ж.р.


1-е скл.
ж.р.
а я
2-е скл.
м.р.
3-е скл.
ж.р.
хто? што?
Н.с.
Р.с.
Д.с.
В.с.
Т.с.
М.с.
мн. л.
адз. л.
адз. л.

Дадатак 3

**Карткі-шпаргалкі для вывучэння тэмы “Правапіс канчаткаў назоўнікаў”**

**Д. і М. склон назоўнікаў 1 скл.**

цвёрды
г,х//з,с — **Е**

мяккі — **І**

зацвярдз.
к//ц — **Ы**

к//ц — **Э**

**К** ⟶ **Ц**

**Г** ⟶ **З**

**Х** ⟶ **С**

**М. склон назоўнікаў 2 скл.**

цвёрды — **Е**

мяккі — **І**

к, г,х //ц,з,с — **У**

зацвярдз. — **Ы**



# Казка-прэзентацыя “Галоўныя члены сказа”

Знаёмцеся: сям'я з дзіўным прозвішчам СКАЗ!
Вялікая, мудрая і шчаслівая:
У ёй шчыра сябруюць словы,
Бо ў кожнага тут важная роля.
[illegible]
[illegible]
За строгі парадак у гэтай сям'і
[illegible] — МАМА і ТАТА.

Знаёмцеся: вось гэта ТАТА —
ДЗЕЙНІКАМ [illegible].
Тата — абаронца сям'і.
Адразу з парога ён высветліць: ХТО? ШТО?
“ХТО? ШТО?” — строгі тата пытае,
І толькі потым у дом запрашае.
[illegible]
З гэтага слова [illegible]
[illegible]
[illegible]
Ну вось мы і ведаем: ДЗЕЙНІК — ХТО? ШТО?

А зараз на кухню вас запрашаю.
Тут МАМУ-ВЫКАЗНІК з усмешкай вітаю.
[illegible] МАМА на кухні [illegible]
[illegible]
[illegible] ШТО РОБІЦЬ? ШТО



















Дадатак 5

## Аднародныя члены сказа

Паспяховаму вывучэнню аднародных сказаў садзейнічаюць метады мадэлявання і канструявання, пры якіх сродкам візуалізацыі з’яўляюцца *смайлікі*.

| **Варыянты заданняў** |
| --- |
| 1. Прачытаць сказы, знайсці аднародныя члены, адлюстраваць іх з дапамогай “смайлікаў”. Важная ўмова: смайлікі павінны “загаварыць”, а “роцік”, які дамалююць вучні, павінен адлюстроўваць член сказа (-, = ці ~) |
| 2. Злучыць стрэлачкай сказы з адпаведнымі схемамі |
| 3. У дадзеных схемах расставіць неабходныя знакі прыпынку |
| 4. Сярод дадзеных схем знайсці тыя, якія занатаваны з памылкай (стварэнне праблемнай сітуацыі) |
| 5. Да схем скласці сказы на вызначаную тэму, напрыклад “Школа”, “У лесе” і г.д. |
| 6. Працягніце сказ. Параўнайце з аўтарскім. Пабудуйце схему |

**Прыклады схем**



Дадатак 6

## Скрайбінг і скетчноўцінг на ўроках беларускай мовы ў V-VII класах







Мал. 1. Скрайбінг на ўроку беларускай мовы ў V класе. Тэма “Тэкст. Час

Мал. 2. Скрайбінг на ўроку беларускай мовы ў VI класе. Тэма “Прыметнік як часціна мовы”.




Мал. 3. Скетч выкананы вучаніцай 7 класа Багданавай Л. Тэма “Службовыя часціны мовы”

Дадатак 7

**Вынікі псіхолага-педагагічных даследаванняў вучняў**












| Прадмет даследавання | Метады даследавання | Вынікі даследавання | |
|---|---|---|---|
| | | **5 клас верасень, 2017** | **6 клас май, 2019** |
| Узровень матывацыі | Тэст-апытальнік Л.Ф.Ціхаміравай | 27% – нізкі ўзровень унутранай матывацыі, 54% – сярэдні ўзровень, 19% – высокі ўзровень | 10% – нізкі ўзровень унутранай матывацыі, 50% – сярэдні ўзровень, 40% – высокі ўзровень |
| Узровень пазнавальнай цікавасці | Методыка ”Канверты“ Г.І.Шчукінай | Канверт з заданнямі па беларускай мове выбралі 23% вучняў, пры гэтым ні адзін з іх не выбраў заданне пошукавага характару | Канверт з заданнямі па беларускай мове выбралі 50% вучняў, пры гэтым палова з іх выбралі заданне пошукавага характару |
| Узровень пазнавальнай актыўнасці | Методыка М.Лук’янавай | 36% – высокі ўзровень пазнавальнай актыўнасці, 46% – сярэдні ўзровень пазнавальнай актыўнасці, 18% – нізкі ўзровень пазнавальнай актыўнасці | 54% – высокі ўзровень пазнавальнай актыўнасці, 36% – сярэдні ўзровень пазнавальнай актыўнасці, 10% – нізкі ўзровень пазнавальнай актыўнасці |
| Узровень якасці засваення ведаў па граматыцы беларускай мовы | Дыягнастычны тэст | Здавальняючы ўзровень – 27%, сярэдні ўзровень – 23%, дастатковы – 36%, высокі –14% | Здавальняючы ўзровень – 14%, сярэдні ўзровень – 23%, дастатковы – 45%, высокі – 18% |

Дадатак 8

**Публікацыя ў ”Настаўніцкай газеце“ №26(8078), 03.03.2018г.**

# Метадычныя сустрэчы

***Для любога кіраўніка важна перавесці кожнага педагога сваёй каманды з пасіўнага назіральніка ў актыўнага і зацікаўленага ўдзельніка. Гэта прымусіла шукаць эфектыўныя формы арганізацыі дзейнасці педагогаў па ўдасканаленні іх прафесійнага майстэрства. І вынікам пошуку стала арганізацыя метадычнага фестывалю “Майстэрства. Вопыт. Творчасць”, які стаў традыцыйным для нашай установы адукацыі.***

Праграма фестывалю застаецца нязменнай і захоўвае тры структурныя моманты: галерэя адкрытых заняткаў і мерапрыемстваў, метадычная выстава, творчая майстэрня. Кожны структурны элемент праграмы аб’яднаны адзіным сэнсавым стрыжнем (метадычнай праблемай). Безумоўна, гэта пытанні, актуальныя для метадычнай прасторы нашай школы: сучасны ўрок = якасць адукацыі; арганізацыя работы з высокаматываванымі і адоранымі вучнямі; фарміраванне даследчых кампетэнцый вучняў; арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці на вучэбных занятках; рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу педагогамі школы пры ажыццяўленні адукацыйнага працэсу.

Для таго каб настаўнікі валодалі неабходным тэарэтычным матэрыялам па акрэсленай праблеме і маглі метадычна правільна падысці да яго рэалізацыі падчас сваёй педагагічнай дзейнасці, фестывалю папярэднічае арганізацыя вучэбных тэарэтычных семінараў, пасяджэнняў школьных метадычных аб’яднанняў, якія выконваюць яшчэ і ролю арганізатара, размяркоўваючы актыўны ўдзел у фестывалі кожнага настаўніка.

Безумоўна, асноўным і самым адказным элементам фестывалю з’яўляецца галерэя адкрытых заняткаў і мерапрыемстваў, бо педагог-удзельнік, прадстаўнік кожнага школьнага метадычнага аб’яднання настаўнікаў, дэманструе сваё майстэрства па вырашэнні пэўнай метадычнай праблемы. Кожныя праведзеныя заняткі падрабязна аналізуюцца, дазваляючы своечасова высвятляць эфектыўны педагагічны вопыт і трансліраваць яго.

Прадстаўлены падчас правядзення фестывалю матэрыял сістэматызуецца і афармляецца ў метадычныя зборнікі, якія з’яўляюцца не толькі своеасаблівай справаздачай, але і карыснай скарбонкай для педагогаў школы.

Штогод фестываль заканчваецца майстэрняй “Творчы настаўнік — творчы вучань”. Мэта творчай майстэрні — жывое мадэляванне адукацыйнага працэсу, больш хуткая адаптацыя педагогаў да аднаўлення зместу адукацыі, фарміраванне ў іх неабходнасці і культуры самаразвіцця, адпрацоўка пэўных прафесійных навыкаў. Так, у настаўнікаў школы за апошнія пяць гадоў была магчымасць праявіць свае акцёрскія здольнасці ў педагагічным тэатры “А ўрок застаецца!”, даказаць, што яны каманда аднадумцаў, прыняўшы ўдзел у гульні “1+1=5”, прадэманстраваць уменні арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці, узяўшы ўдзел у спартыўных спаборніцтвах “Слава школьнай той сям’і, дзе садружнасць у цане!”, удасканаліць прафесійныя кампетэнцыі дзякуючы “Сваёй гульні”, ажыццявіць аптымальны выбар дыдактычных сродкаў на аўкцыёне педагагічных ідэй “Ад педагагічнага майстэрства — да якасці адукацыі”.

Эмоцыі і ўражанні ўнутры калектыву падчас удзелу ў творчай майстэрні вельмі розныя, але, як паказвае практыка, ніхто не застаецца абыякавым. Гульні доўга абмяркоўваюцца, аналізуюцца іх вынікі, а пасля педагогі актыўна выкарыстоўваюць новыя атрыманыя веды і падыходы ў рабоце, што дазваляе пазбягаць шаблоннасці як у штодзённай выкладчыцкай дзейнасці, так і ў наладжванні міжасабовых зносін з вучнямі.

Час такіх метадычных сустрэч — гэта час, калі настаўнікі падводзяць вынікі, набываюць новы метадычны вопыт, дзеляцца з калегамі ведамі, займаюцца самаадукацыяй, час, калі арганізуецца дыялог, які спрыяе фарміраванню ў настаўнікаў уменняў крытычна мысліць, разважаць, аператыўна прымаць рашэнне ў нестандартнай сітуацыі, удзельнічаць у дыскусіях, наладжваць прафесійныя зносіны з калегамі.

Штогод удзельнікі фестывалю адзначаюць неабходнасць яго правядзення яшчэ і з мэтай развіцця ўзаемадзеяння школьных метадычных аб’яднанняў, распаўсюджвання лепшых практык арганізацыі метадычнай работы. Вынік фестывалю — педагагічны савет, на якім прыняты рашэнні, што арыентуюць педагагічны калектыў на рэалізацыю акрэсленых задач, дазваляюць прасачыць за дынамікай паказчыкаў эфектыўнасці адукацыйнага працэсу, высветліць праблемы, якія патрабуюць тэрміновага вырашэння.

**Наталля ОСІПАВА,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 15 Полацка Віцебскай вобласці.**

## Метадычнае лата

| | | | |
|---|---|---|---|
| Контурныя карты, на якіх пазначаны маршруты вандровак па краінах, дзе пражываюць незвычайныя жыхары (часціны мовы, члены сказа). Задача настаўніка: арганізаваць урок-падарожжа. | Абагуленыя схемы-апоры, якія з'ўляюцца своеасаблівымі алгарытмамі для вернага напісання канчатка назоўніка. | Выкарыстоўваюцца падчас вывучэння аднародных членаў сказа, дапамагаюць вучням зразумець і засвоіць сродкі сувязі, парадак размяшчэння і месца ў сказе аднародных членаў сказа, а таксама пастаноўку знакаў прыпынку. | **?** |
| Графічная форма арганізацыі інфармацыі, пры якой выдзяляюцца асноўныя сэнсавыя адзінкі, што фіксуюцца ў выглядзе схемы з абазначэннем усіх сувязей паміж імі. | Кожны вучань выбірае картку, дзе адлюстравана адно з вывучаных граматычных паняццяў, напрыклад, “род”, “лік”, “адзіночны”, “множны” “скланенне”, “склон”, “час” і т.п. Вядучыя з карткамі “назоўнік”, “прыметнік”, “дзеяслоў”, “займеннік”. Задача: знайсці сабе сяброў. | Візуалізацыя інфармацыі пры дапамозе графічных сімвалаў, якія адлюстроўваюць змест і ўнутраныя сувязі. Настаўнік сваё выступленне ілюструе адразу, на хаду, маркерам на белай дошцы ці ватмане. | **?** |
| Адлюстраванне лінгвістычнага паняцця ў выглядзе нейкай істоты ці прадмета, сюжэтнай карцінкі, з наступным агучваннем намаляванага. | Дынамічная візуалізацыя-мультфільм пра вялікую і дружную сям'ю Сказ. | Візуальны спосаб фіксавання інфармацыі з мінімальнай колькасцю запісанага тэксту; своеасаблівая візуальная нататка, элементамі якой з'ўляюцца рукапісны тэкст, малюнкі і схемы з базавых элементаў (круг, квадрат, трохвугольнік, лінія, кропка). | **?** |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **У падарожжа…** | **Шпаргалка** | **Смайлікі** | **?** |
| **Кластар** | **Ажыўленне** | **Скрайбінг** | **?** |
| **Свая апора** | **У гасцях у казцы…** | **Скетчноўцінг** | **?** |